*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Е Т А

10 КРАСАВІКА 2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 67
(26425)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

## САЦЫЯЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА: КАМУ І НА ЯКІХ УМОВАХ?

Адрасная сацыяльная дапамога, падтрымка маламаёмных грамадзян, ветэранаў і інвалідаў — усе гэта стане тэмай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **начальніка ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Пятроўны СЯРГЕЕВАЙ, начальніка аддзела па справах інвалідаў Рыты Валянцінаўны СУШКО і начальніка аддзела па справах ветэранаў Івана Пятровіча НАГІБІНА. «Прамая лінія» пройдзе 14 красавіка з 11 да 12 гадзін па тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэдне пытанні прымаюцца па нумары (8 017) 287 17 57.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# Беларусі і Расіі не хапае яснасці і празрыстасці ў адносінах

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з губернатарам Ленінградскай вобласці Валерыем Сердзюковым.**

«Калі хто-небудзь скажа, што ў Беларусі ёсць нейкія тэндэнцыі ў бок ад Расіі, то гэта адкрытая няпраўда. Мы не бачым свайго будучага без Расіі, мы асуджаны жыць разам. Але нам хацелася б большай яснасці і празрыстасці ў адносінах. Для нас гэта вельмі важна, асабліва на гэтым этапе», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў кіраўніцтве краіны праціўнікаў збліжэння і цеснай інтэграцыі з Расіяй няма. «Калі я або нехта іншы выказваецца на тэму беларуска-расійскіх адносінаў, то я гавару гэта сумленна і адкрыта, прытрымліваюся такой пазіцыі і ў СНД, і ў ЕўрАзЭС. Што датычыцца нашых двухбаковых адносінаў, то мы нічога адзін ад аднаго не ўтойваем. Розніца толькі ў тым, што калі кіраўніцтва Расіі дазваляе крытычна выказвацца ў мой адрас, то робіць гэта не публічна, я ж дапускаю гаварыць публічна пра тыя праблемы, якія існуюць у нашых адносінах», — сказаў беларускі лідар.

Пры гэтым ён адзначыў, што пасля нядаўняй рабочай паездкі ў Гомельскую вобласць, прэса «застракацела паведамленнямі аб тым, што Беларусь хоча напалохаць Расію Захадам, яшчэ кімсьці». «Такіх прынцыпаў у ажыццяўленні нашай палітыкі няма, асабліва адносна Расіі», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў прэтэнзіі ў адрас Расіі ў сувязі з закрыццём расійскага рынку для беларускіх тавараў. Паводле слоў Прэзідэнта, гэта самая вялікая праблема, і яна супярэчыць афіцыйнаму курсу Расійскай Федэрацыі. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, на лонданскім саміце «вялікай дваццаткі» было прынята важнае рашэнне, што ў гэты складаны перыяд 20 дзяржаў не павінны закрываць свае рынкі і тым самым знішчаць эканомікі, якія развіваюцца. «Калі 80 працэнтаў сусветнай эканомікі закрыецца, у тым ліку і расійская, то такім дзяржавам, з экспартаарыентаванай эканомікай, як Беларусь, будзе вельмі складана. Таму прынята правільнае рашэнне разам выходзіць з крызісу і не закрывацца, — адзначыў Прэзідэнт. — Нам не трэба ніякіх пераваг, але павінна быць свабодная канкурэнцыя».

«Больш як 50 працэнтаў нашага знешняга гандлю прыпадае на Еўрасаюз. Вось і ўся цікавасць, а не тое, што Лукашэнка «прадаўся Захаду», як паўтарае расійская прэса. Калі Еўрасаюз нас пастаянна прэсуе, і такую яго палітыку можна зразумець, дык як жа зразумець Расію, якая фактычна сёння, як мне дакладваюць, блакіруе пастаўку нашай прадукцыі?» — заявіў кіраўнік дзяржавы. У якасці прыкладу Прэзідэнт прывёў сітуацыю з пастаўкамі на расійскі рынак цукру, малака. «Што ж гэта за адзіная безбар'ерная эканамічная прастора? Нават калі б мы ўсё прадалі ў Расію, гэта не нанесла б ніякага эканамічнага ўрону іх дзяржаве», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама дадаў, што калі не гаварыць аб гэтых фактах адкрыта, то расійскія СМІ нават не звернуць увагі на тыя праблемы, якія сёння існуюць у двухбаковым гандлі.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

## Абмеркаваны пытанні бяспекі Саюзнай дзяржавы

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка і сакратар Савета Бяспекі Расійскай Федэрацыі Мікалай Патрушаў абмеркавалі 9 красавіка ў Мінску пытанні бяспекі Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, у тым ліку пытанні ваеннага і ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў.**

«Я сустракаюся сёння з вамі не толькі як з высокапастаўленым чыноўнікам — нас звязвае даўняе асабістае знаёмства. Мне вельмі прыемна сёння, праз, можна сказаць, шмат часу, сустрэцца з вамі для таго, каб абмеркаваць некаторыя аспекты адносінаў Беларусі і Расіі. Я вельмі рады, што вы прыехалі да нас і можаце паглядзець, чым мы тут жывём і як працуем ва ўмовах сусветнага крызісу. Словам, у нас ёсць аб чым пагаварыць», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

У сваю чаргу сакратар Савета Бяспекі Расійскай Федэрацыі падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за прадастаўленую магчымасць абмеркаваць пытанні, што датычацца сферы нацыянальнай бяспекі, якія актуальныя як для Беларусі, так і для Расіі. «Мне асабліва прыемна знаходзіцца ў Мінску, я тут вучыўся. Бачу, як тут усё мяняецца ў лепшы бок», — адзначыў Мікалай Патрушаў. Ен таксама выказаў задаволенасць тым, як будуецца супрацоўніцтва паміж Саветамі Бяспекі Беларусі і Расіі. «Гэта заўсёды згода, узаемаразуменне і выпрацоўка канструктыўных рашэнняў. Спадзяюся, што такі парадак будзе захоўвацца і мы таксама будзем дзейнічаць узгоднена».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Аляксандр Лукашэнка 10 красавіка ў Маскве сустрэнецца з Патрыярхам Кірылам

У развіццё дамоўленасцяў, дасягнутых паміж Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам і Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Кірылам у Сочы, 10 красавіка ў ходзе рабочага візіту ў Расійскую Федэрацыю адбудзецца сустрэча кіраўніка беларускай дзяржавы з Прадстаяцелем Рускай праваслаўнай царквы. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў кіраўнік прэс-службы Прэзідэнта Павел Лёгкі.

Паритетбанк

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ!

**ОАО «ПАРИТЕТБАНК» СООБЩАЕТ, ЧТО С 20 МАЯ 2009 ГОДА БУДЕТ ПРОИЗВОДИТЬСЯ ВЫПЛАТА ДИВИДЕНДОВ ПО ИТОГАМ РАБОТЫ БАНКА ЗА 2008 ГОД В РАЗМЕРЕ:**

- **по простым акциям – 0,0128 рубля на акцию,**
- **по привилегированным – 3 рубля на акцию.**

Список лиц, имеющих право на получение дивидендов, составлен в соответствии с реестром акционеров банка на 13 марта 2009 года.

Физические лица могут получить дивиденды при наличии паспорта:
- в центральном офисе ОАО «Паритетбанк» по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 9/4, тел. 8-017-288-38-29
- РКЦ № 1 г. Минск, пр. Победителей, 21, тел. 8-017-203-97-22
- ЦБУ № 1 в г. Витебске, ул. 2-я Продольная, 3, тел. 8-0212-23-84-02
- ЦБУ № 3 в г. Минске, ул. Тимирязева, 125, корпус 9, тел. 8-017-385-21-88, а также г. Минск, пр. Независимости, 91-2Н, тел. 8-017-259-63-46
- ЦБУ № 4 в г. Минске, ул. Кижеватова, 7/2, тел. 8-017-201-90-17
- ЦБУ № 5 в г. Минске, ул. Немига, 8, тел. 8-017-209-43-52, 227-63-42
- ЦБУ № 6 в г. Гродно, пл. Советская, 6, тел. 8-015-274-48-03, 274-15-13
- ЦБУ № 7 в г. Пинске, ул. Иркутско-Пинской дивизии, 36, тел. 8-0165-35-91-59, 32-35-59
- ЦБУ № 8 в г. Могилеве, ул. Тимирязевская, 44, тел. 8-0222-28-72-41, 28-72-53
- ЦБУ № 9 в г. Жлобине, ул. Урицкого, 86, тел. 8-02334-2-88-93, 2-89-04
- ЦБУ № 10 в г. Мозыре, ул. Ленинская, 6, тел. 8-02351-2-27-76, 2-10-68
- ЦБУ № 11 в г. Столине, ул. Комсомольская, 9, тел. 8-01655-2-01-37, 2-00-75
- ЦБУ № 12 в г. Бобруйске, ул. Пролетарская, 28, тел. 8-0225-52-61-31, 52-31-18
- ЦБУ № 14 в г. Гомеле, ул. Гагарина, 46, тел. 8-0232-74-43-86, 74-43-85
- ЦБУ № 15 в г. Бресте, пр-т Машерова, 35, тел. 8-0162-20-16-17, 22-11-87
- ЦБУ № 16 в г. Барановичи, ул. Брестская, 279, тел. 8-0163-40-04-28, 44-08-47
- ЦБУ № 18 в г. Новополоцке, ул. Молодежная, 166а, тел. 8-0214-55-01-60, 55-13-26
- ЦБУ № 19 в г. Лида, ул. Кирова, 8, тел. 8-01561-3-50-00, 6-73-62.

**Телефон для справок: 8 017 288 49 43**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27.10.2006 г. № 5. УНП 100233809.*

ISSN 1990 - 763X

### ХІДЗІНК НА ВЫШЫНІ, ГЛЕБ ЗНОЎ НЕ ГУЛЯЎ

Адбыліся першыя матчы 1/4 фіналу Лігі чэмпіёнаў УЕФА: «Манчэстэр Юнайтэд» — «Порту» — 2:2, «Вільярэал» — «Арсенал» — 1:1, «Ліверпуль» — «Чэлсі» — 1:3, «Барселона» — «Баварыя» — 4:0.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

### НАЙБОЛЬШАЯ «ХУТКАСЦЬ» СЯЎБЫ — НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

Як паведаміў **намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль ПАЎЛОЎСКІ,** збожжавыя і зернебабовыя пасеяны на плошчы 340 тысяч гектараў — 33,4 працэнта агульнай плошчы. На Брэстчыне засеяна 61,6 працэнта плошчаў, Віцебшчыне — 5 працэнтаў, Гомельшчыне — 70,1 працэнта, Гродзеншчыне — 48,2 працэнта, Міншчыне — 23,5 працэнта, Магілёўшчыне — 8,4 працэнта. Найбольшую «хуткасць» сяўбы дэманструе Гродзенская вобласць — 9,8 працэнта ў дзень, а самы сціплы паказчык пакуль за Віцебскай — 2,4.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

Час сеяць

*Насенная «кропка» ў Лепелі.*

Грошы

# УКЛАДЫ: НАЙБОЛЬШЫ РОСТ — У СТУДЗЕНІ

**З пачатку года больш як на 200 тысяч рублёў у разліку на аднаго жыхара рэспублікі папоўніліся зберажэнні, што трымаюць людзі ва ўкладах і ашчадных сертыфікатах: паводле апошніх звестак, якія наша газета атрымала ў Нацыянальным банку Беларусі, на 1 красавіка на аднаго беларуса прыпадала 1 мільён 603 тысячы 400 рублёў зберажэнняў, размешчаных у дэпазітах і сертыфікатах. На пачатак гэтага года адпаведная лічба раўнялася 1 мільёну 401 тысячы 600 рублям.**

За першы квартал рублёвыя ўклады і ўклады ў замежнай валюце насельніцтва ў беларускіх банках павялічыліся больш як на 1,9 трыльёна рублёў, ці на 14,3 працэнта. Прычым, трэба заўважыць, што найбольш «ураджайным» для банкаў стаў першы месяц года пасля вядомых падзей, калі ў пераразліку на нацыянальную валюту дэпазіты папоўніліся больш як на 1 трыльён, у лютым іх рост склаў больш за 743 мільярды рублёў. Такім чынам, сакавік у першым квартале выглядае найбольш сціплым месяцам адносна «прыходу» зберажэнняў насельніцтва ў банкі.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» **намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Міхаіл ЖУРАВОВІЧ,** на пачатак красавіка ўклады ў банках дасягнулі амаль 15,2 трыльёна рублёў. Што датычыцца дэпазітаў у нацыянальнай валюце, то яны склалі 6,3 трыльёна рублёў. Між іншым, на пачатак мінулага месяца гэтая лічба была большай за 6,5 трыльёна. На дэпазіты ў замежнай валюце за папярэдні месяц укладчыкі «кінулі» каля 100 мільёнаў долараў (не выключана, што грошы з рублёвых укладаў проста «перакачавалі» ў валютныя): калі на пачатак лютага яны складалі 2,8 мільярда долараў ЗША, на пачатак сакавіка — каля 3 мільярдаў, то на 1 красавіка — звыш за 3,1 мільярда долараў.

Разам з тым, на рынку банкаўскіх укладаў для насельніцтва працягваюцца тэндэнцыі, якія пачаліся напрыканцы лютага — стаўкі па валютных дэпазітах няўхільна зніжаюцца. Пасля сакавіцкага падзення ставак да 12 %, у красавіку ў чарговы раз пасля рэкамендацыі галоўнага банка даходнасць па дэпазітах, якія зноў прыцягваюцца, зніжана да 10 %. Да таго ж, у шэрагу камерцыйных банкаў пануе меркаванне, што гэта не апошняя непрыемнасць для трымальнікаў долараў, еўра і расійскіх рублёў у банках — у маі, чэрвені працэнтная стаўка можа «згубіць» яшчэ каля 2 %. Прынамсі, верагоднасць такога сцэнарыя была агучаная і старшынёй Асацыяцыі беларускіх банкаў Феліксам Чарняўскім, які выказаў дапушчэнне, што з наступнага месяца ці ў чэрвені стаўкі па валютных дэпазітах будуць складаць 8 %.

Дарэчы, у Нацыянальным банку не замоўчваюць таго, што падобныя захады накіраваныя на павышэнне прывабнасці ўкладаў менавіта ў нацыянальнай валюце. Сённяшні ўзровень працэнтных ставак па ўкладах у беларускіх рублях, падкрэсліваюць там, не толькі перакрывае тэмпы інфляцыі і абараняе зберажэнні людзей ад абясцэньвання, але і прыносіць даход. Калі ўлічыць, што, у адрозненне ад валютных, працэнтная стаўка па дэпазітах у рублях пакуль застаецца нязменнай і складае ад 20 да 22%, то сапраўды, менавіта ўклады ў нацыянальнай валюце могуць стаць сёлета больш перспектыўнымі. Тым больш, як заўважыў Міхаіл Журавовіч, у найбліжэйшы час не плануецца ўносіць ніякіх змяненняў у стаўкі па рублёвых дэпазітах.

Іншая рэч, што істотны прыток менавіта рублёвых укладаў стрымлівае, як нам падаецца, чыста псіхалагічны фактар: многія яшчэ не адышлі пасля непапулярнай меры з правядзеннем аднаразовай дэвальвацыі рубля. Аднак, як ужо неаднаразова заяўлялася, у тым ліку і старшынёй Нацыянальнага банка Пятром Пракаповічам, падобнага больш не будзе, і аднаразовая істотная дэвальвацыя рублю не спатрэбіцца. Прынамсі, прагноз галоўнага банкіра, які прагучаў на сустрэчы з журналістамі напрыканцы студзеня, наконт таго, што ў першым квартале калідор хістанняў беларускага рубля да валютнага кошыка будзе блізкім да нуля, і на 1 красавіка кошт кошыка складзе каля 960 рублёў, цалкам спраўдзіўся. Да месца, мяркуем, нагадаць і пра тое, што, згодна з прагнознымі паказчыкамі па курсавой палітыцы, кошт кошыка замежных валют будзе хістацца ў межах плюс-мінус 5 % на працягу ўсяго гэтага года.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## Урад Беларусі ўстанавіў памеры датацый на пуцёўкі для дзяцей у летнія аздараўленчыя лагеры

Адпаведная пастанова № 433 падпісана Саветам Міністраў, паведамілі БЕЛТА ў Апараце Саўміна. Датацыя са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання на адну пуцёўку ў лагеры з кругласутачным знаходжаннем складзе Br255 тыс., у лагеры з дзённым знаходжаннем — Br110 тыс., у профільныя лагеры з кругласутачным знаходжаннем не менш як 9 дзён — Br115 тыс. На аказанне дапамогі ў падрыхтоўцы стацыянарных лагераў да работы ў летні перыяд будзе выдзелена Br1 млрд 500 млн.

**БЕЛТА.**

Еш сваё!

# Калі вам не хапала ў каўбасе шакаладу...

**Памятаеце анекдот? Хлеба ў іх не было, чырвоную ікру даводзілася намазваць адразу на сервелат. Цяпер падобным чынам, напэўна, змогуць на цалкам законных падставах жартаваць і айчынныя спажыўцы. Справа ў тым, што каўбасу з кавалачкамі ...шакаладу пачаў выпускаць Кобрынскі мясакамбінат. У найбліжэйшы час прадпрыемства плануе распачаць таксама выраб для харчавання школьнікаў і дашкольнікаў сасісак з «наборам» з 10 вітамінаў, наладзіць вытворчасць вараных каўбас з уключэннямі з маслін, алівак, грыбоў, сыру. Пра ўсе гэтыя навінкі «Звязда» папрасіла расказаць галоўнага тэхнолага прадпрыемства Людмілу КАДЗІРАВУ.**




— Ідэя выпускаць каўбасу з шакаладам нарадзілася пасля наведвання семінараў у Германіі і Аўстрыі, дзе давялося пакаштаваць такія вырабы. Немцы паклалі ў іх больш шакаладу, чым потым мы, аднак сама задума спадабалася. Падумалася, а чаму б і нам не наладзіць выпуск такой арыгінальнай прадукцыі? Па вялікім рахунку, «лінейка» сыравэнджаных каўбас — а менавіта яе ўзялі за аснову — у розных прадпрыемстваў практычна аднолькавая, яны адрозніваюцца толькі водарам. Папрасіла ўзоры, прывезла іх на дэгустацыю. Пасля яе пачалі рыхтаваць абсталяванне, — расказала Людміла Васільеўна.

Навінка на 97 працэнтаў складаецца з сыравэнджанай каўбасы са свініны і на 3 працэнты — з кавалачкаў да 4 міліметраў — айчыннага горкага шакаладу (дарэчы, для першай доследнай партыі суразмоўца набывала яго за ўласныя грошы ў звычайнай краме). Каўбаскі невялікія — ад 8 да 12 сантыметраў (меншыя па памерах за сасіскі), вырабляюцца ў танюткай абалонцы, якую не трэба чысціць, а можна есці. Адна штучка важыць каля 20 грамаў, гэта такія своеасаблівыя «семкі», якія зручна даваць, скажам, дзецям. «Усё ж каўбаса — гэта лепш, чым якія там чыпсы».

Есці каўбасу з шакаладам можна і ў якасці лёгкай закускі. У яе, паводле слоў Людмілы Кадзіравай, арыгінальны смак, які павінен спадабацца, напрыклад, жанчынам. «Для лёгкага сяброўскага жаночага застолля — пад келіх віна, шампанскага ці марціні — ідэальны варыянт». Увогуле, упэўнена суразмоўца, попыт на новую прадукцыю павінен быць, галоўнае, каб спажывец хоць бы раз паспытаў такую каўбаску.

Навінка вырабляецца для продажу ў вакуумнай упакоўцы і на вагу. У апошнім выпадку можа захоўвацца чатыры месяцы, у першым — крыху менш. Вакуумная ўпакоўка вагой 300 грамаў каштуе каля 10 тысяч рублёў. Набыць каўбасу з шакаладам можна ў крамах Кобрына, Брэста, у сталіцу навінку пакуль пастаўлялі на Камароўскі рынак. «Гэта былі пробныя партыі — для вывучэння попыту. Каўбаса вырабляецца даволі хутка, на працягу пяці сутак. Наступныя партыі будуць гатовыя да Вялікадня».

Дарэчы, у дзень нашай размовы на прадпрыемстве прайшла дэгустацыя сасісак, у склад якіх уключана 10 вітамінаў, так патрэбных найперш маленькім дзецям. Зноў жа, згодна з патрабаваннямі да такой прадукцыі, прызначанай для харчавання школьнікаў і дашкольнікаў, у ёй зніжанае ўтрыманне солі і адсутнічаюць спецыі. Затое такія сасіскі ўтрымліваюць пшанічную клятчатку, якая выводзіць з арганізма радыенукліды. Новая прадукцыя была ўхвалена і, як зазначыла Людміла Кадзірава, яе выпуск плануецца распачаць у маі. Абмяркоўвалася і прапанова па вытворчасці вараных каўбас з разнастайнымі ўключэннямі: маслінамі, аліўкамі, грыбамі, сырам, што ў выглядзе дробных кавалачкаў будуць прысутнічаць у вырабах.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

РОЗГАЛАС — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### НА ВЫХАДНЫЯ ПАХМУРНА, А МЕСЦАМІ НЕВЯЛІКІЯ ДАЖДЖЫ

**У бліжэйшыя выхадныя характар надвор'я будзе вызначацца атмасферным фронтам, які сёння пачынае марудна рухацца з боку Заходняй Еўропы праз усю тэрыторыю Беларусі, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.**

Таму ў суботу, нядзелю і панядзелак на ўсёй тэрыторыі Беларусі істотна павялічыцца воблачнасць, а ў асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ў суботу і нядзелю ўначы ад мінус 4 градусаў па паўночным усходзе да 7 цяпла па паўднёвым захадзе, удзень — 8—14, па захадзе да плюс 16 градусаў. У панядзелак стане крыху цяплей, уначы чакаецца ад мінус 1 да плюс 6, удзень — 7—13 градусаў, на паўднёвым захадзе — 15—17 цяпла. У аўторак і сераду ападкаў ужо не будзе. Тэмпература паветра ўначы ад 1 марозу да 6 цяпла, удзень — 10—16, па захадзе да 18—20 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ВЫПІЎ БУТЭЛЬКУ — СЕЎ ЗА РУЛЬ

**Зразумела, нічым добрым гэта не магло скончыцца: напачатку кіроўца пратараніў дзве прыпаркаваныя машыны, а пасля ўехаў у слуп вулічнага асвятлення.**

Паводле звестак ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, здарэнне каля дванаццаці ночы адбылося ў сталіцы на вуліцы Сяліцкага. А за рулём аўтамабіля «Форд» знаходзіўся 23-гадовы мужчына, які, між іншым, ужо затрымліваўся супрацоўнікамі Дзяржаўтаінспекцыі за кіраванне транспартным сродкам у п'яным выглядзе. На гэты раз, перш чым сесці за руль, парушальнік выпіў паўлітра гарэлкі: у яго крыві знойдзена 2,17 праміле алкаголю. Дарэчы, у гэтай гісторыі ёсць яшчэ адна цікавая акалічнасць: як стала вядома, аўтамабіль, на якім «рассякаў» нецвярозы кіроўца, ён атрымаў ад знаёмага, каб адрамантаваць. Цяпер аўтааматара чакае яшчэ той «сюрпрыз». Акрамя таго, у гэтым ДТЗ пацярпела дзяўчына, якая сядзела ў «Фордзе» на пярэднім пасажырскім месцы: у яе закрытыя пераломы сцягна і касцей правай галёнкі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### «ПЕЖО» ВЫНЕСЛА НА ТРАТУАР

**У Мінску пасля сутыкнення двух аўтамабіляў — «Рэно» і «Пежо», апошні выехаў на тратуар і збіў жанчыну: прычым кіроўца «Рэно», як высветлілася, не меў пасведчання — ён быў пазбаўлены права кіравання за ўчыненне ДТЗ з цяжкімі наступствамі і асуджаны судом Уздзенскага раёна.**

Паводле звестак аддзела агітацыі і прапаганды ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, здарэнне зафіксавана каля шасці вечара ў сераду на перакрыжаванні праспекта Ракасоўскага з мясцовым праездам да кінатэатра «Салют». 51-гадовая пацярпелая ў выніку наезду атрымала адкрыты аскольчаты перялом абедзвюх касцей левай галёнкі і дастаўлена ў рэанімацыйнае аддзяленне.

**Ігар ГРЫШЫН.**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.04.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 820,00 |
| ▲ 1 еўра | 3 748,91 |
| 1 латвійскі лат | 5 287,33 |
| 1 літоўскі літ | 1 085,87 |
| 1 чэшская крона | 141,07 |
| 1 польскі злоты | 844,02 |
| ▲ 1 расійскі рубель | 84,10 |
| 1 украінская грыўня | 350,96 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 33,5334 |
| 10 UAH | 41,6564 |
| 1000 BYR | 11,8451 |
| EUR | 44,5860 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## БПС-БАНК

*Бульвар имени Мулявина, 6, 220005, г. Минск-5*
*Телефон (8 017) 289 41 48, факс 210 03 42, e-mail: inbox@bpsb.by, интернет: www.bpsb.by*

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2009 года

Открытое акционерное общество «Белпромстройбанк»

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 01.04.2009 | На 01.04.2008 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 261117,7 | 167164,3 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 | 127967,5 | 262619,6 |
| 4 | Ценные бумаги | 1103 | | 336908,1 | 350192,3 |
| | для торговли | 11031 | 3 | 249,1 | 150190,9 |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 3,1 | 32653,1 | 70493,9 |
| | в наличии для продажи | 11033 | 3,2 | 304005,9 | 129507,5 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 4 | 303534,1 | 441880,5 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | 3270400,9 | 2376977,4 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 6 | 1624,0 | 1624,1 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 7 | 179782,0 | 167884,1 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 8 | 52948,1 | 32705,7 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | | 4534282,4 | 3774048,0 |
| 11 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 9 | 233130,0 | 65889,8 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 10 | 623728,1 | 501210,2 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 11 | 2788803,4 | 2669173,5 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | 110264,1 | 28940,0 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 12 | 76116,9 | 62984,1 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 3832042,5 | 3328197,6 |
| 18 | КАПИТАЛ | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 13 | 416527,2 | 169866,7 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | 0,0 | 0,0 |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 38891,8 | 29044,8 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 14 | 137735,2 | 123628,2 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 15 | 109085,7 | 123310,7 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | | 702239,9 | 445850,4 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | 4534282,4 | 3774048,0 |
| 26 | ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 16 | 3191523,1 | 2625291,4 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 17 | 1545445,0 | 1270386,5 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2009 года

Открытое акционерное общество «Белпромстройбанк»

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 01.04.2009 | На 01.04.2008 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 124601,4 | 80115,7 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 85273,9 | 53241,0 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 18 | 39327,5 | 26874,7 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 45289,0 | 39179,6 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 9446,9 | 7035,3 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 19 | 35842,1 | 32144,3 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 20 | -7408,2 | 10654,6 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 21 | 78,6 | 12,3 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | 0,8 | 0,5 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 22 | 19803,5 | 122,7 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 23 | 40872,8 | 2019,5 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 24 | 52181,8 | 42924,1 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 25 | 6548,8 | 1444,6 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 8413,0 | 5544,6 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 21766,5 | 21669,9 |

**Генеральный директор** — **Г.П. Кухоренко**

**Главный бухгалтер** — **А.В. Борейко**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.11.2008 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

10 КРАСАВІКА 2009 г. ПЯТНІЦА № 14 (15568)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

# Гатуем PR!

Днямі завяршыўся Другі студэнцкі PR-форум «Папараць-кветка», які праходзіў у Інстытуце журналістыкі. Яго арганізатарамі выступілі кафедра тэхналогій камунікацыі Інстытута журналістыкі БДУ і Інстытут PR. Генеральным партнёрам мерапрыемства стала міжнародная кампанія «VDEL».

Галоўная мэта форуму — фарміраванне і развіццё студэнцкай PR-супольнасці, уцягненне моладзі ў навукова-практычную дзейнасць у галіне PR. «Папараць-кветка» з'яўляецца пляцоўкай для абмену досведам паміж студэнтамі, выкладчыкамі і майстрамі-практыкамі ў галіне PR, месцам сустрэч будучых спецыялістаў з іх патэнцыйнымі працадаўцамі.

Удзел у форуме ўзялі каля 500 студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях «Інфармацыя і камунікацыя», «Мэнэджмент», «Рэклама», «Маркетынг», «Журналістыка». Акрамя беларусаў на форум прыехалі маладыя людзі з ВНУ Санкт-Пецярбурга, Масквы, Ніжняга Ноўгарада, Кіева, Нікалаева і інш. Спецыялісты-практыкі з Расіі і Украіны правялі для іх майстар-класы і круглыя сталы аб эфектыўнасці PR у сацыяльных медыя. У рамках форуму прайшлі навукова-практычная канферэнцыя, кірмаш студэнцкіх праектаў, прэзентацыі, конкурсы, гульні, выстава тэматычнай літаратуры.

Адметнай асаблівасцю форуму стала арыгінальная форма яго правядзення. Арганізатары сустракалі гасцей у фартухах з лагатыпам форуму, яскравую кулінарную афарбоўку атрымала і канцэпцыя мерапрыемства — «Гатуем PR!».

— Многія з арганізатараў форуму мінулага года сталі PR-спецыялістамі буйных беларускіх кампаній, — патлумачыла дырэктар Інстытута PR Наталля Грамадскіх, — гэта сур'ёзны паказчык развіцця PR у Беларусі. Форум не проста аб'ядноўвае, ён матывуе і ўсяляе ўпэўненасць і ў студэнтаў, і ў PR-прафесіяналаў. PR — не толькі яскравая, модная, перспектыўная спецыяльнасць, але і запатрабаваная ў нашай краіне прафесія сённяшняга дня і будучыні.

**Каця ДЗЕМЯНЧУК.**

❐ **Запрашаю для сумеснага будаўніцтва 2-кватэрнага дома каля Брэста сям'ю без шкодных звычак, будматэрыялы маюцца.**
**Тэл. 8 029 206 70 61.**

Прамая лінія

# ЯК СТАЦЬ АФІЦЭРАМ

**Сёння на ўсе пытанні, якія датычацца ўступнай кампаніі на ваенныя факультэты беларускіх ВНУ, адказваюць намеснік начальніка ўпраўлення ваеннай адукацыі і падрыхтоўкі войскаў Узброеных Сілаў палкоўнік Ілья РЫЖАНКОЎ, начальнік Ваеннай акадэміі Беларусі генерал-маёр Сяргей БОБРЫКАЎ, начальнік Мінскага сувораўскага ваеннага вучылішча генерал-маёр Мікалай СКОБЕЛЕЎ.**



Фота БЕЛТА.

***— Якія змяненні ў параўнанні з мінулым годам адбыліся ў правілах паступлення ў ваенныя ВНУ Беларусі?***

**Генадзь,** *Гродна.*

**Ілья Рыжанкоў:** — Зараз праходзяць працэдуру ўзгаднення змяненні ў правілы прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, якія зацвярджаюцца Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гаворка ідзе аб праекце Указа, які распрацоўваецца ў рэспубліканскіх органах дзяржаўнага кіравання. У адпаведнасці з нормамі праекта гэтага заканадаўчага акта, чакаецца нязначнае зрушэнне тэрмінаў прыёму дакументаў у ВНУ і, адпаведна, змяненні тэрмінаў правядзення ўступных экзаменаў і залічэння абітурыентаў. Акрамя таго, у ім прапаноўваецца змяніць парадак прыёму вайскоўцаў у ваенныя навучальныя ўстановы.

Сутнасць пытання ў тым, што прыём вайскоўцаў, якія маюць рэкамендацыі вайсковых часцей, плануецца праводзіць па асобным конкурсе ў межах да 50 працэнтаў ад кантрольных лічбаў прыёму.

Пры прыняцці гэтых змяненняў яны своечасова будуць даведзеныя да абітурыентаў. Яшчэ адно планаванае змяненне закране тэрміны прыёму дакументаў, правядзення ўступных экзаменаў і залічэння абітурыентаў у ваенныя навучальныя ўстановы міністэрстваў абароны Расіі і Казахстана ў інтарэсах Узброеных Сілаў Беларусі. Міністэрствам абароны прынята рашэнне ў 2009 годзе праводзіць уступную кампанію ў ваенныя навучальныя ўстановы міністэрстваў абароны Расіі і Казахстана ў другім патоку, гэта значыць, адначасова з ваеннымі факультэтамі грамадзянскіх навучальных устаноў.

***— Наколькі папулярныя ваенныя прафесіі сярод дзяўчат?***

**Ірына,** *Бабруйск.*

**Ілья Рыжанкоў:** — Ваенныя прафесіі сярод прадстаўніц нашай прыгожай паловы, несумненна, карыстаюцца папулярнасцю. Так, на сёння ў ваенных навучальных установах Беларусі праходзяць навучанне ў якасці курсантаў 34 вайскоўцы-жанчыны: толькі ў Ваеннай Акадэміі вучыцца 19 дзяўчат. З іх 18 — на факультэце сувязі і АСУ і адна — на авіяцыйным факультэце. Ёсць дзяўчаты і сярод курсантаў ваеннага факультэта БДУ. Там яны асвойваюць спецыяльнасць «міжнародныя адносіны» і «журналістыка». Таксама на ваенна-тэхнічным факультэце ў БНТУ вучацца тры курсанткі па спецыяльнасці «фінансавае забеспячэнне і эканоміка баявой і гаспадарчай дзейнасці войскаў».

Сёлета набор дзяўчат на навучанне ў якасці курсантаў будзе ажыццёўлены толькі ў Ваенную акадэмію па спецыяльнасці «Сістэмны аналіз функцыянавання аўтаматызаваных сістэм кіравання». На 20 сакавіка па выніках папярэдняга адбору кандыдатаў для паступлення на гэтую спецыяльнасць, што праводзіўся ў ваенных камісарыятах, конкурс сярод дзяўчат складае 7 чалавек на 1 месца.

***— Раскажыце, калі ласка, пра тое, як у Беларусі працуе сістэма па перападрыхтоўцы адстаўных афіцэраў на грамадзянскія прафесіі. Якія навучальныя ўстановы займаюцца гэтым, прыкладны спіс прафесій і хто аплачвае перападрыхтоўку?***

**Святлана,** *Мінск.*

**Ілья Рыжанкоў:** — Перападрыхтоўка афіцэраў, звольненых з ваеннай службы, як і астатніх грамадзян Беларусі, ажыццяўляецца ў агульнай сістэме павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі грамадзян у адпаведнасці з абраным наступным кірункам дзейнасці. Перападрыхтоўка можа ажыццяўляцца ў адпаведных цэнтрах, а таксама ў структурных падраздзяленнях вышэйшых навучальных устаноў, створаных для гэтых мэтаў. Аплачваецца перападрыхтоўка з уласных сродкаў грамадзян або за кошт сродкаў прадпрыемстваў і арганізацый, якія накіроўваюць спецыялістаў на перападрыхтоўку.

***— Факультэт Генштаба ў Ваеннай акадэміі створаны толькі для беларускіх вайскоўцаў, ці могуць там вучыцца замежныя грамадзяне? Калі так, то ці азначае гэта, што замежныя афіцэры будуць вучыцца па нейкіх асаблівых праграмах?***

**Алег Лаўроў,** *Мінск.*

**Сяргей Бобрыкаў:** — У Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь створаны ўсе ўмовы для таго, каб у ёй маглі вучыцца замежныя вайскоўцы. Мы гатовыя да навучання шырокага спектра вайскоўцаў па розных спецыяльнасцях. Пытанні па праграмах навучання і па колькасці курсантаў узгадняюцца на міжнародным узроўні. На факультэце Генштаба мы гатовы вучыць замежных вайскоўцаў, але толькі па міждзяржаўных дагаворах.

***— Якія новыя ваенныя спецыяльнасці з'явіліся ў Беларусі за апошнія гады? Назавіце, калі ласка, найбольш запатрабаваныя ваенныя прафесіі?***

**Уладзімір,** *Мінск.*

**Ілья Рыжанкоў:** — У сувязі з утварэннем ваенных факультэтаў у вышэйшых навучальных установах пачынаючы з 2003 года ў Беларусі ажыццяўляецца падрыхтоўка па наступных новых ваенных спецыяльнасцях: на ваенным факультэце БДУ — гэта «Міжнародныя адносіны», «Геаінфармацыйныя сістэмы», «Журналістыка»; на ваенна-тэхнічным факультэце БНТУ — «Фінансавае забеспячэнне і эканоміка баявой і гаспадарчай дзейнасці войскаў»; на ваенным факультэце Мінскага дзяржаўнага вышэйшага радыётэхнічнага каледжа — «Тэхнічная эксплуатацыя сродкаў наземнага забеспячэння палётаў», «Пад'ёмна-транспартныя, будаўнічыя, дарожныя машыны і абсталяванне»; на ваенна-транспартным факультэце БДУІР — «Кіраванне падраздзяленнямі транспартных войскаў (аднаўленне і будаўніцтва шляхоў зносінаў)».

У 2009 годзе ўпершыню будзе ажыццёўлены набор курсантаў для навучання па спецыяльнасцях «Радыёэлектронныя сістэмы» па спецыялізацыі «радыёэлектронныя сістэмы лакацыі і навігацыі» — на ваенным факультэце БДУІР і «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва» — на ваенна-тэхнічным факультэце БНТУ. Па выніках конкурсу папярэдніх гадоў пры паступленні ў ваенныя навучальныя ўстановы і выніках адбору кандыдатаў для паступлення, якія праводзіцца ў ваенных камісарыятах, сёлета найбольш запатрабаванымі ваеннымі спецыяльнасцямі з'яўляюцца: «Сістэмны аналіз функцыянавання аўтаматызаваных сістэм кіравання», «Кіраванне падраздзяленнямі сілаў спецыяльных аперацый», «Эксплуатацыя паветранага транспарту» (Ваенная акадэмія).

У лік найбольш запатрабаваных спецыяльнасцяў ваенных факультэтаў увайшлі «Міжнародныя адносіны», «Геаінфармацыйныя сістэмы», «Фізічная падрыхтоўка вайскоўцаў» і «Ваенна-медыцынская справа».

***— У якіх краінах беларускія грамадзяне вучацца вайсковай справе і па якіх спецыяльнасцях?***

**Уладзімір Усольцаў,** *Смаргонь.*

**Ілья Рыжанкоў:** — Мы супрацоўнічаем з ваеннымі навучальнымі ўстановамі Расійскай Федэрацыі па прынцыпе вывучэння вопыту і падрыхтоўкі ваенных кадраў па дэфіцытных спецыяльнасцях, якія немэтазгодна і эканамічна нявыгадна адкрываць у сістэме вайсковай адукацыі Беларусі.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)**



# ЗАО «Дельта Банк»

*220036, г. Минск, ул. Розы Люксембург, 95. Тел. 256 19 08*
*www.deltabank.by*

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2009 г.

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2008 г. | 2007 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | 547,2 | 0,0 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 | 17288,6 | 90,3 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | | 0,0 | 0,0 |
| | для торговли | 11031 | 3 | 0,0 | 0,0 |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 3.1 | 0,0 | 0,0 |
| | в наличии для продажи | 11033 | 3.2 | 0,0 | 0,0 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 4 | 2049,9 | 15326,4 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | 78920,3 | 171,7 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 6 | 703,2 | 0,0 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 7 | 11438,8 | 985,0 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 8 | 3650,2 | 1165,4 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | | 114598,2 | 17738,8 |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 9 | 0,0 | 0,0 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 10 | 21124,2 | 0,0 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 11 | 25159,2 | 529,5 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | 0,0 | 0,0 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 12 | 3640,2 | 760,8 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 49923,6 | 1290,3 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 13 | 64000,0 | 16000,0 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | 0,0 | 0,0 |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 260,0 | 120,0 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 14 | 253,8 | 167,7 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 15 | 160,8 | 160,8 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | | 64674,6 | 16448,5 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | 114598,2 | 17738,8 |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 16 | 35838,2 | 2,6 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 17 | 27456,3 | 0,0 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 января 2009 г.

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2008 г. | 2007 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 7752,4 | 469,5 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 2620,9 | 3,8 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 18 | 5131,5 | 465,7 |
| 4 | Комиссионые доходы | 2021 | | 27418,4 | 12,9 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 198,0 | 12,6 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 19 | 27220,4 | 0,3 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 20 | 2585,1 | 844,3 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 21 | 0,0 | 72,0 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | 0,0 | 0,0 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 22 | 737,5 | -148,9 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 23 | 4660,8 | 792,6 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 24 | 37967,9 | 1845,6 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 25 | 396,8 | 60,1 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 269,5 | 187,2 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 226,1 | 230,9 |

## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2008 год

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статей капитала / Наименование показателей | Символ | Уставный фонд | Эмиссионный доход | Резервный фонд | Накопленная прибыль (убыток) | Фонд переоценки статей баланса | Всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 2 | Остаток на 1 января 2007 г. | 3011 | 760,2 | — | 699,7 | - 642,8 | 135,8 | 952,9 |
| 3 | Изменения статей капитала | 3012 | 15 239,8 | — | - 579,7 | 810,5 | 25,0 | 15 495,6 |
| | В том числе: | | | | | | | |
| 3.1 | прибыль (убыток со знаком «минус») | 30121 | x | x | x | 230,9 | x | 230,9 |
| 3.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | — | x | — | — | x | — |
| 3.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 15 239,8 | — | x | — | x | 15 239,8 |
| 3.3.1 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 16 000,0 | — | x | x | x | 16 000,0 |
| 3.3.2 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | — | x | — |
| 3.3.3 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - 760,2 | x | x | x | x | - 760,2 |
| 3.4 | проведение переоценки статей баланса | 30124 | x | x | x | x | 25,0 | 25,0 |
| 3.5 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | — | — | - 579,7 | 579,7 | — | — |
| 3.6 | прочие изменения | 30126 | — | — | — | - 0,1 | — | - 0,1 |
| 4 | Остаток на 1 января 2008 г. | 3013 | 16 000,0 | — | 120,0 | 167,7 | 160,8 | 16 448,5 |
| 5 | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 6 | Остаток на 1 января 2008 г. | 3011 | 16 000,0 | — | 120,0 | 167,7 | 160,8 | 16 448,5 |
| 7 | Изменения статей капитала | 3012 | 48 000,0 | — | 140,0 | 86,1 | — | 48 226,1 |
| | В том числе: | | | | | | | |
| 7.1 | прибыль (убыток со знаком «минус») | 30121 | x | x | x | 226,1 | x | 226,1 |
| 7.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | — | x | 140,0 | - 140,0 | x | — |
| 7.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 48 000,0 | — | x | — | x | 48 000,0 |
| 7.3.1 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 48 000,0 | — | x | x | x | 48 000,0 |
| 7.3.2 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | — | x | — |
| 7.3.3 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | — | x | x | x | x | — |
| 7.4 | проведение переоценки статей баланса | 30124 | x | x | x | x | — | — |
| 7.5 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | — | — | — | — | — | — |
| 7.6 | прочие изменения | 30126 | — | — | — | — | — | — |
| 8 | Остаток на 1 января 2009 г. | 3013 | 64 000,0 | — | 260,0 | 253,8 | 160,8 | 64 674,6 |

## ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ на 1 января 2009 г.

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2008 г. | 2007 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 7010 | | 7749,9 | 426,2 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 7011 | | -2622,1 | -3,8 |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 7012 | | 27409,0 | 12,8 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 7013 | | -198,0 | -12,1 |
| 6 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 7014 | | 2236,4 | 83,7 |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 7015 | | 0,0 | 72,0 |
| 8 | Доход в форме дивидендов | 7016 | | 0,0 | 0,0 |
| 9 | Прочие полученные доходы | 7017 | | 4555,9 | 197,6 |
| 10 | Прочие уплаченные расходы | 7018 | | -32566,2 | -1664,1 |
| 11 | Уплаченный налог на прибыль | 7019 | | -6,1 | -47,4 |
| 12 | Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и обязательствах | 701 | | **6558,8** | **-935,1** |
| 13 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 7020 | | -1153,6 | -30,0 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах | 7021 | | 0,0 | 0,0 |
| 15 | Чистое снижение (прирост) кредитов и других денежных средств в банках | 7022 | | 11852,5 | -12796,8 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) кредитов, выданных клиентам | 7023 | | -78774,1 | 593,3 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 7025 | | -16454,4 | -354,6 |
| 18 | Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов | 702 | | **-84529,6** | **-12588,1** |
| 19 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 7030 | | 0,0 | 0,0 |
| 20 | Чистый прирост (снижение) кредитов и других средств банков | 7032 | | 7006,7 | 0,0 |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 7033 | | 22105,5 | 215,2 |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 7034 | | 0,0 | 0,0 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 7035 | | 15756,9 | -333,2 |
| 24 | Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств | 703 | | **44869,1** | **-118,0** |
| 25 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | **-33101,7** | **-13641,2** |
| 26 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 27 | Приобретение основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов | 7110 | | -14581,4 | -706,3 |
| 28 | Реализация основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов | 7111 | | 0,0 | 0,0 |
| 29 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений | 7112 | | -703,1 | 0,0 |
| 30 | Реализация долгосрочных финансовых вложений | 7113 | | 0,0 | 0,0 |
| 31 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | **-15284,5** | **-706,3** |
| 32 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 33 | Эмиссия акций | 7211 | | 48000,0 | 15200,0 |
| 34 | Выкуп собственных акций | 7212 | | 0,0 | -658,1 |
| 35 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 7213 | | 0,0 | 697,9 |
| 36 | Выплата дивидендов | 7214 | | 0,0 | 0,0 |
| 37 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | **48000,0** | **15239,8** |
| 38 | Влияние изменений официального курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 642,2 | 562,8 |
| 39 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | **256,0** | **1455,1** |
| 40 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | 1 | **X** | **1732,2** |
| 41 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 1 | **1988,2** | **X** |

**Руководитель** **И.С. Партнова**

**Главный бухгалтер** **С.И. Миркевич**
**Дата подписания 02 марта 2009 г.**

**Достоверность бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала, отчета о движении денежных средств подтверждена:**
**Директор частного предприятия КПМГ** **А.Н. Шкодин**
**27 марта 2009 г.**

*Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 27 от 01.09.2007 г. УНП 807000015*

KPMG

**Частное предприятие «КПМГ»**
ул. Сторожевская, 8
220002, Минск, Беларусь

Телефон +375(17) 210 04 73
Факс +375(17) 210 04 75
Интернет www.kpmg.by

Акционерам ЗАО «Дельта Банк»,
ул. Розы Люксембург, 95
г. Минск
Республика Беларусь
220036
ЗАО «Дельта Банк» зарегистрировано
в Национальном банке Республики Беларусь
25.01.2001. Регистрационный № 807000015

Исх. номер 04-03/11/305

**Аудиторское заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности**

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности закрытого акционерного общества «Дельта Банк» (далее — «Банк»), состоящий из бухгалтерского баланса на 1 января 2009 года, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала и отчета о движении денежных средств за 2008 год, а также примечаний, включая краткое описание существенных элементов учетной политики, и прочих пояснений. Сравнительная информация в бухгалтерской (финансовой) отчетности подготовлена на основании данных бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка за 2007 год, которая была проверена другой аудиторской организацией, аудиторское заключение которой датировано 25 марта 2008 года и содержит безусловно положительное мнение.

*Ответственность руководства относительно бухгалтерской (финансовой) отчетности*

Ответственность за подготовку и объективное представление бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь несет руководство Банка. Ответственность руководства Банка заключается в разработке, внедрении и поддержании системы внутреннего контроля, относящейся к подготовке и объективному представлению бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений, вызванных мошенничеством либо ошибкой; а также в выборе и применении соответствующей учетной политики и определении оценочных значений, адекватных текущим обстоятельствам.

*Ответственность аудиторов*

В наши обязанности входит выражение мнения о бухгалтерской (финансовой) отчетности на основе проведенного нами аудита, а также предоставление сведений о выполнении Банком нормативов безопасного функционирования и состоянии внутреннего контроля Банка.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь и Международными стандартами аудита, если они не противоречат названным требованиям. Эти стандарты и требования обязывают нас соответствовать этическим требованиям и планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить разумную уверенность в том, что бухгалтерская (финансовая) отчетность не содержит существенных искажений.

Аудит включает в себя проведение процедур для получения аудиторских доказательств по суммам и раскрытиям, представленным в бухгалтерской (финансовой) отчетности. Отбор процедур проводится на основании суждений аудитора включающих оценку риска наличия существенных искажений в бухгалтерской (финансовой) отчетности, вне зависимости от того, явилось ли их причиной мошенничество или ошибка. При оценке данного риска аудитор рассматривает работу системы внутреннего контроля, относящуюся к подготовке и объективному представлению бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка, в целях разработки соответствующих аудиторских процедур, но не в целях выражения мнения об эффективности работы самой системы внутреннего контроля Банка. Аудит также включает в себя оценку приемлемости используемой учетной политики обоснованности оценочных значений, сделанных руководством Банка, и оценку общего представления бухгалтерской (финансовой) отчетности.

Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства обеспечивают достаточные и надлежащие основания для выражения нашего аудиторского мнения.

*Аудиторское мнение*

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность достоверно отражает во всех существенных отношениях финансовое положение ЗАО «Дельта Банк» на 1 января 2009 года, а также результаты деятельности и движение денежных средств за 2008 год, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь, касающимися подготовки бухгалтерской (финансовой) отчетности.

В ходе аудита нами было установлено, что Банком допускались факты несоблюдения в 2008 году нормативов безопасного функционирования, установленных Национальным банком Республики Беларусь для банков, изложенные на странице 68 прилагаемой отчетности. Другие факты несоблюдения нормативов безопасного функционирования, установленных Национальным банком Республики Беларусь для банков, не обнаружены.

Мы не обнаружили факты, свидетельствующие о существенном несоответствии состояния системы внутреннего контроля Банка характеру и объему осуществляемых им операций, которые могли бы привести к существенному искажению бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка.

**Заключение по иным требованиям законодательства**

В наши обязанности также входит оценка методики расчетов и достоверности информации, включенной в формы пруденциальной отчетности 2801 «Расчет достаточности нормативного капитала», 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе», 2809 «Расчет ликвидности», составленные Банком и представляемые на 1 января 2009 года. Ответственность за подготовку данных форм пруденциальной отчетности несет руководство Банка. В наши обязанности входит выражение мнения о достоверности указанных форм пруденциальной отчетности.

По нашему мнению, вышеназванные формы пруденциальной отчетности на 1 января 2009 года составлены ЗАО «Дельта Банк» достоверно во всех существенных аспектах в соответствии с Инструкцией о порядке составления и представления банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями пруденциальной отчетности в Национальный банк Республики Беларусь, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 31 октября 2006 года № 172 (с учетом дополнений и изменений).

**Шкодин Александр Николаевич**
Директор

**Демидович Наталья Сигизмундовна**
Руководитель аудиторской проверки

27 марта 2009 года

г. Минск, Республика Беларусь

Частное предприятие «КПМГ»

Свидетельство о государственной регистрации
выдано Минским горисполкомом на основании
решения от 20.11.2008, УНП 190241132

Лицензия на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0495354
выдана Министерством финансов Республики Беларусь до 25.02.2014
на основании решения от 05.01.2009 № 3

Специальное разрешение (лицензия)
на осуществление аудиторской деятельности в банках
и небанковских кредитно-финансовых организациях № 10
выдано на основании решения специальной квалификационной комиссии
Национального банка Республики Беларусь № 4 от 10.09.2008
сроком на 5 лет

**Аудиторское заключение получено 27 марта 2009 г.**

**Главный бухгалтер Миркевич С.И.** **Подпись** ________

***КПМГ, белорусское частное предприятие и фирма-член сети независимых фирм КПМГ, входящих в состав КПМГ Интернейшнл, ассоциации, созданной по законодательству Швейцарии.***

